**Список цитируемых источников**

1. Послевоенная история Германии: российско-немецкий опыт и перспективы : материалы конф. рос. и нем. историков : сб. ст. / под ред. Б. Бонвеча, А.Ю. Ватлина. — М. : ДиректМедиа Паблишинг, 2007. — 340 с.
2. *Андреев, Л. Г.* Зарубежная литература XX века : учеб. для вузов / Л. Г. Андреев, А. В. Карельский, Н. С. Павлова. — М. : Высш. шк., 2004. — 559 с.
3. *Леонова, Е. А.* Немецкая литература XX века. Германия, Австрия : учеб. пособие / Е. А. Леонова. — М. : Наука, 2010. — 360 с.
4. *Лапин, И. Л.* Зарубежная литература. XX век : учеб.-метод. пособие / И. Л. Лапин, В. В. Здольников, С. В. Лапунов ; под ред. И. Л. Лапина. — Витебск : Изд-во ВГУ им. П. М. Машерова, 2007. — 146 с.

УДК 811.161.3’27

**Н. І. Чарніцкая**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# МЕТАДЫЧНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ І ПАДЫХОДЫ ДА РАЗВІЦЦЯ ЗВЯЗНАЙ МОВЫ І МАЎЛЕННЯ

**Уводзіны.** У практыцы школьнага навучання настаўнікі карыстаюцца агульнадыдактычнымі і агульнаметадычнымі прынцыпамі навучання. Пад метадычнымі прынцыпамі развіцця звязнага маўлення ў методыцы выкладання беларускай мовы разумеюць зыходныя тэарэтычныя палажэнні, агульныя правілы, якімі кіруецца настаўнік пры выбары формаў, метадаў, прыёмаў працы па развіцці маўлення вучняў пры навучанні беларускай мове.

**Асноўная частка.** На думку С. В. Мартынкевіч, «метадычнымі прынцыпамі фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі з’яўляюцца: прынцып актуалізацыі камунікатыўна рэлевантных моўных сродкаў у працэсе вывучэння праграмнага матэрыялу па беларускай мове, які накіраваны на ўзнаўленне моўных адзінак, неабходных для спараджэння выказвання, і матывацыі вучняў да маўленчай камунікацыі па-беларуску; прынцып сітуацыйна-тэматычнага ўпарадкавання тэкставага матэрыялу, які патрабуе вывучэння моўных законаў і маўленчых паняццяў на аснове тэкстаў розных стыляў і жанраў з апісаннем сітуацый, умоў і сферы зносін; прынцып камунікатыўнай крэатыўнасці і актыўнасці навучання, які абумоўлівае фарміраванне ўменняў прадуктыўнай ацэнкі сітуацыі і самастойнага выбару шляхоў рэалізацыі ўласнага выказвання» [1, с. 59].

Прынцып апоры на тэкст у яго жанрава-стылёвай разнастайнасці накіроўвае настаўніка на выкарыстанне аналітыка-сінтэтычных і камунікатыўных практыкаванняў, пры выкананні якіх вучні ўпэўніваюцца, што ў беларускай мове функцыянуюць розныя стылі і жанры маўлення. У мове размяжоўваюць інфарматыўныя і выяўленчыя сродкі, якія абслугоўваюць розныя сферы маўленчай дзейнасці людзей. Настаўнік павінен памятаць, што «неабходна развіваць мову вучняў не наогул, а мову гутарковую, навуковую, афіцыйна-дзелавую, публіцыстычную, мастацкую» [2, с. 88]. Таму ў якасці дыдактычнага матэрыялу на ўроку павінны выкарыстоўвацца тэксты розных стыляў і жанраў.

Так, В. У. Вінаградаў акцэнтаваў увагу на тым, што стылістыка «разглядае пытанні аб функцыях і сферах ужывання варыянтных — паралельных і сінанімічных — форм спражэння і скланення, а таксама ступеней параўнання», аб «функцыях і сферах паралельных сінтаксічных зваротаў, а таксама кампазіцыйна ці семантычна абмежаваных, звязаных сінтаксічных з’яў, характэрных толькі для тых ці іншых разнавіднасцей маўлення» [3, с. 167].

Прынцып адзінства і ўзаемасувязі развіцця маўлення і мыслення заснаваны на тым, што мова і мысленне цесна ўзаемазвязаны: слова ўздзейнічае на нараджэнне думкі, а думка стымулюе працэс выбару неабходнага слова. З гэтага палажэння вынікае: трэніроўка моватворчага механізма — неабходная ўмова для актывізацыі і развіцця маўлення вучняў. На думку Г. М. Валочка, «працуючы над любым выказваннем, школьнікі вучацца назіраць і аналізаваць, знаходзіць адрозненні і падабенства, класіфікаваць, абагульняць, сістэматызаваць, тлумачыць, даказваць. У выніку такой актыўнай дзейнасці развіваецца і маўленне, і мысленне вучняў» [5, с. 109].

Яшчэ Я. Колас падкрэсліваў, што «развіваць мову асобна ад думкі немагчыма: слова — дзейсны супрацоўнік нашага мыслення. Вялікі запас слоў — адна з умоў дакладнага і яснага выражэння нашай думкі. Адсюль развіццё вуснага маўлення ёсць і развіццё адной з прылад нашага мыслення» [4, с. 250].

Прынцып актыўнай камунікацыі патрабуе ад настаўніка арыентавацца ў працы з вучнямі на віды маўленчай дзейнасці: чытанне, аўдзіраванне, пісьмо, гаварэнне. Пры гэтым у цэнтры ўвагі настаўніка тая акалічнасць, што мова перш за ўсё з’яўляецца сродкам зносін. Вучань павінен быць актыўным удзельнікам працэсу суразмоўніцтва. Фарміраванне ўменняў ствараць вусныя і пісьмовыя выказванні, асэнсоўваць змест прачытанага і пачутага, дакладна адказваць на пытанні, фармуляваць вывады разам з засваеннем моўных сродкаў складаюць змест работы настаўніка і вучняў на ўроку беларускай мовы.

© Чарніцкая Н. І., 2017

Даследчык С. В. Мартынкевіч падкрэслівае, што прынцып узаемасувязі развіцця вуснага і пісьмовага маўлення «патрабуе ад настаўніка выкарыстання формаў працы, накіраваных як на развіццё вуснага, так і на развіццё пісьмовага маўлення. Улічваючы, што часта на ўроках беларускай мовы пісьмовая форма маўлення пераважае, настаўнік, кіруючыся названым прынцыпам, павінен суадносіць прыёмы працы пры фарміраванні ў вучняў уменняў вуснай і пісьмовай камунікацыі» [1, с. 8].

Прынцып сувязі работы па развіцці маўлення з вывучэннем усіх раздзелаў школьнага курса мовы і літаратуры арыентуе настаўніка на выкарыстанне форм працы па развіцці маўлення як пры вывучэнні ўсіх раздзелаў курса беларускай мовы, так і пры вывучэнні літаратуры. Так, Т. А. Ладыжынская ўсе заданні па развіцці маўлення ўмоўна падзяляе на пяць груп:

1) заданні аналітычнага характару па гатовым тэксце;
2) заданні аналітыка-сінтэтычнага характару па гатовым тэксце (аналіз гатовага тэксту і стварэнне на гэтай аснове элементаў тэксту);
3) заданні на перапрацоўку гатовага тэксту (удасканаленне тэксту);
4) заданні на стварэнне новага тэксту на аснове прапанаванага;
5) заданні на стварэнне ўласнага тэксту.

Асноўнымі прыёмамі працы па развіцці маўлення ў методыцы выкладання мовы з'яўляюцца: чытанне тэкстаў розных стыляў і жанраў; сэнсава-граматычны, стылістычны, структурна-кампазіцыйны аналіз тэксту; фармулёўка пытанняў да тэксту; рэцэнзаванне вуснага адказу вучня; рэдагаванне тэксту; складанне кампазіцыйнай схемы тэксту; структураванне тэкстаў у адпаведнасці з тэматыкай і інш.

Як адзначае Г. М. Валочка, «немагчыма вылучыць універсальныя камунікатыўныя ўменні, якія б забяспечвалі стварэнне тэкстаў усіх стыляў, тыпаў і жанраў. Кожнае канкрэтнае ўменне непасрэдна звязана з відам выказвання. Таму лічыцца, што вучыць школьнікаў трэба не ўменням наогул, а канкрэтным уменням, якія залежаць ад стылю, тыпу і жанру выказвання» [5, с. 108].

У сваю чаргу М. Г. Яленскі лічыць, што «настаўнік, вызначаючы сістэму працы па развіцці маўлення, павінен памятаць, што вучань ніколі не навучыцца выказваць свае думкі, уступаць у суразмоўніцтва, пакуль не будзе пастаўлены перад неабходнасцю дзейнічаць (гаварыць) ва ўмовах штучнага маўленчага асяроддзя — у працэсе школьнага навучання» [6, с. 52].

**Заключэнне.** На думку даследчыкаў і метадыстаў, арганізацыя працы па развіцці маўлення вучняў павінна ажыццяўляцца на аснове агульнадыдактычных, прыватнаметадычных і спецыфічных прынцыпаў. Кіруючыся імі, настаўнік выбірае метады і сродкі навучання школьнікаў.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Мартынкевіч, С. В.* Маўленчая дзейнасць як аснова фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў / С. В. Мартынкевіч // Сучасная моўная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: праблемы, перспектывы : матэрыялы рэсп. нав.-практ. канф. (да 80-годдзя праф. В. У. Протчанкі), Мінск, 9 крас. 2010 г. — Мінск : РІВШ, 2010. — С. 56—60.
2. Развитие русской речи учащихся средних и старших классов / М. Б. Успенский [и др.] ; под ред. Н. М. Шанского, И. Г. Чистяковой. — Л. : Просвещение : Ленингр. отд-е, 1998. — 225 с.
3. *Ляшчынская, В. А.* Методыка выкладання беларускай мовы : вучэб. дапам. / В. А. Ляшчынская, З. У Шведава. — Мінск : РІВШ, 2007. — 252 с.
4. *Колас, Я.* Методыка роднае мовы : зб. тв. : у 12 т. / Я. Колас. — Мінск, 1976. — Т. 12. — 319 с.
5. *Валочка, Г. М.* Тэарэтыка-метадычныя асновы развіцця звязнага маўлення вучняў на ўроках беларускай мовы: 5—10 клас / Г. М. Валочка. — Мінск : НІА, 2005. — 204 с.
6. *Яленскі, М. Г.* Асобасны падыход у методыцы навучання беларускай мове: тэарэтыка-эксперыментальнае даследаванне / М. Г. Яленскі. — Мінск : НІА, 1997. — 171 с.


УДК 821.161.3:82–3

**В. М. Ярмоліч**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## ФОРМЫ АЎТАРСКАЙ ПРЫСУТНАСЦІ Ў АПАВЯДАННІ ВЕНАНЦЫ БУТРЫМА «ХАТА»

**Уводзіны.** Праблема аўтара і яго прысутнасці ў творы з'яўляецца прадметам навуковых дыскусій. Адны даследчыкі яе адмаўляюць, другія прызнаюць. Так, Р. Барт і яго паслядоўнікі лічаць, што аўтар знаходзіцца ў мінулым адносна сваёй кнігі. Але большасць даследчыкаў лічаць, што твор нельга разглядаць асобна ад яго стваральніка. Мы таксама кіруемся гэтай думкай. Існуе вялікая колькасць тэрмінаў для абазначэння прысутнасці аўтара ў мастацкім творы. Адзін з іх — аўтарская свядомасць. Гэта «выяўленне аўтарскага светапогляду як сістэмы абагульненых поглядаў чалавека на аб'ектыўны

© Ярмоліч В. М., 2017